УДК 930.2;27(476)

# МЕМУАРЫ ДУХАВЕНСТВА XVIII–XIX стст. ЯК КРЫНІЦА ПА АРГАНІЗАЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ОРГАНАЎ ЕПАРХІЯЛЬНАГА КІРАЎНІЦТВА ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

**Антановіч Зінаіда Васільеўна**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У выніку аналізу апублікаваных успамінаў і дзённікаў вышэйшага кліру праваслаўнага, уніяцкага і рымска-каталіцкага духавенства XVIII–XIX стст. аўтар робіць высновы аб магчымасці іх выкарыстання для адсочвання працэсаў фарміравання нарматыўнага рэгулявання канфесійнай сферы ў Расійскай імперыі, вызначэння функцый іерархаў і органаў епархіяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда (кансісторый) і іх асабовага складу. Улічваючы суб'ектыўнасць крыніц асабістага паходжання для іх верыфікацыі прапаноўваецца выкарыстоўваць матэрыялы дзейнасці іерархаў і кансісторый хрысціянскіх канфесій, нарматыўныя акты Расійскай імперыі і дыпламатычныя дакументы, афіцыяльныя перыядычныя выданні рымска-каталіцкай царквы.*

Крыніцы асабістага паходжання, у прыватнасці дзённікі і ўспаміны XVIII–XIX стст., з'яўляюцца цікавым здабыткам для навукоўцаў, аднак яны ў рознай ступені прыцягваюцца даследчыкамі сацыяльна-гуманітарнай накіраванасці, што абумоўлена суб'ектыўнасцю прыведзенай інфармацыі, вызначанай не толькі часам з'яўлення крыніц і перыядам, які мінуў ад згадваемых падзей да напісання мемуараў, але светаадчуваннем аўтара, яго паходжаннем, сферай дзейнасці і атачэннем [2].

Адным з першых значную рукапісную спадчыну, якую апрацаваў і падрыхтаваў да выдання І. Грыгаровіч, пакінуў беларускі архіепіскап Г. Каніскі. Ім нададзена мала ўвагі арганізацыйным аспектам дзейнасці кансісторый, але ў дачыненні праваслаўнай і ўніяцкай цэркваў напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай ён вылучаў у структуры апошняй смаленскага архіепіскапа Ю. Лепкоўскага, які па меркаванні Г. Каніскага не меў уласнай епархіі, але менаваўся архіепіскапам смаленскім і архімандрытам ануфрыеўскім [3, с. 197, 201; 15, s. 31, 54].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Па звестках беларускага ўніяцкага епіскапа, а пазней – полацкага праваслаўнага архіепіскапа В. Лужынскага, які перадаў свае ўспаміны Казанскай духоўнай акадэміі, згаданы вышэй Ануфрыеўскі манастыр да 1803 г. стаў месцам знаходжання Полацкай уніяцкай кансісторыі, асабовы склад якой таксама называе аўтар [4, с. 11, 26–27, 30, 34]. Акрамя ўласнага вопыту В. Лужынскі спасылаецца на матэрыялы канцылярыі ўніяцкіх мітрапалітаў і кансісторыі, апытанне архіеіскапа І. Красоўскага [4, с. 36], пра дзейнасць якога ён прыводзіць пэўныя звесткі. Напрыклад, у 1820 г. архіепіскап быў абвінавачаны ў злоўжываннях і імператарам у мэтах збору аргументацыі пад прычынай рэвізіі кансісторыі і семінарыі быў накіраваны І. Булгак [4, с. 48–51].

іншы прадстаўнік уніяцкага кліру, а затым літоўскі мітрапаліт І. Сямашка перадаў свае ўспаміны ў Імператарскуіс акадэмію навук у Санкт-Пецярбургу з мэтай іх выдання. Яны складаліся з чатырох частак, кожная з якіх суправаджалася публікацыяй дакументаў [9, с. IV]. Кансісторыі ў іх ён надаў мала ўвагі, аднак, пэўныя змены ў яе дзейнасці ён увёў, напрыклад, выкарыстанне рускай мовы ў перапісцы замест польскай у 1833 г. [9, с. 94] і ўдзельнічаў у арганізацыі размеркавання матэрыялаў дзейнасці Віленскай і Луцкай кансісторый пасля іх ліквідацыі, што пацвярджаецца захаванымі вопісамі спраў [9, с. 488–490; 8, арт. 1977]. Пры гэтым ён акцэнтаваў уласны ўнёсак у фарміраванне нарматыўнай базы дзейнасці ўніяцкай царквы.

Першы магілёўскі рымска-каталіцкі арцыбіскуп С. Богуш-Сестранцэвіч у сваім дзённіку, які ўтрымлівае копіі таксама эпісталярных крыніц, адлюстраваў, як і І. Сямашка, нарматыўнае ўладкаванне статусу царквы і функцый створаных органаў яе кіраўніцтва на ўнутрыпалітычнай і міжнароднай арэнах. Так, у 1797 г. ім рыхтаваўся праект указа з падзелам паўнамоцтваў кансісторыі і біскупа, што пазней было ўдакладнена [10; 13, арк. 4–7]. Некалькі разоў у дзённіку згадваецца, што межы дыяцэзій плануецца прывесці ў адпаведнасць з межамі губерняў [10, с. 304], але гэта не адбылося [7, арт. 14122, 17379, 18504]. Аўтарам адлюстраваны таксама арганізацыйныя моманты, як  аб’яўленне кансісторыі пра ад’езд з Магілёва 21 ліпеня 1797 г. [10, с. 314] Абмеркаванне з нунцыям таксама выклікаў загад па разглядзе спраў аб скасаванні шлюбу [10, с. 325]. У гэтым кантэксце неабходна згадаць мемуары і.А. Аркеці. Ён акрэсліў папярэднісіс перамовам з уладамі Расійскай імперыі сітуацыіс і шмат увагі прысвяціў уніяцкай царкве, перавагу аддаісчы асабоваму складу вышэйшага кліру і выпускаісчы з гледжання органы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда [1, с. 1–53; 11].

Адным з набліжаных прадстаўнікоў рымска-каталіцкага духавенства да арцыбіскупа С. Богуш-Сестранцэвіча быў С. Шантыр. Ён адзначаў, што рэзыдэнцыя біскупа ў Магілёве была сціслай настолькі, што ледзве ўмясціла ўласнуіс канцылярыіс біскупа і кансісторыіс [14, s. 42]. Упарадкаванне працы кансісторыі С. Шантыр звязвае з прызначэннем афіцыяла А. Берэнта, які ўпарадкаваў дзейнасць кансісторыі, што адлюстравана з пэўнымі разыходжаннямі ў працы С. Шантыра і матэрыялах дзейнасці Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі, яе афіцыйным перыядычным выданні [5, арк. 32; 12, s. 118; 14, s. 176–177, 194–195]. У дачыненні ўніяцкай царквы ён крытыкаваў прызначэнне афіцыяламі кансісторый базыльянаў [14, s. 108; 8, арт. 2354].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, мемуарныя крыніцы па арганізацыі дзейнасці кансісторый хрысціянскіх канфесій прадстаўлены ўспамінамі і дзённікамі вышэйшага кліру і набліжаных да яго асоб. Успаміны пераважна пакінулі прадстаўнікі ўніяцкага духавенства, якія перайшлі ў праваслаўе пасля Полацкага царкоўнага сабору, і яны былі падрыхтаваны ў другой палове XIX ст., а дзённік С. Богуш-Сестранцэвіч вёў падчас знаходжання на пасадзе. Гэта абумовіла магчымасці з іх выкарыстаннем прасачыць уплыў суб'ектыўных фактараў на выпрацоўку нарматыўных дакументаў агульнадзяржаўнага і міжнароднага характару, падрабязнасць звестак пра арганізацыйныя аспекты дзейнасці кансісторый і ўласцівасці іх асабовага складу. Аднак, спецыфіка крыніц асабовага паходжання патрабуе Іх верыфікацыі шляхам спраўджвання з захаванымі матэрыяламі дзейнасці органаў епархіяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда праваслаўнай, уніяцкай і рымска-каталіцкай цэркваў, нарматыўнымі дакументамі Расійскай імперыі і Рыму, адпаведнымі публікацыямі ў афіцыйным перыядычным выданні рымска-каталіцкай царквы.

## Літаратура


1. Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкови в империи Российской и царстве Польском. – Санкт-Петербург: Типография второго отделения Е.И.В. канцелярии, 1849. – 240 с.

2. Ищенко, О.В. Неверов, А.В. Отечественные мемуары второй половины XVIII–XIX в. как исторический источник // Грамота. – 2016. – № 6(68): в 2 ч. – Ч. 1. – С. 81–85.

3. Конисский, Г.О. Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского : сост. прот. Иоанном Григоровичем. – 2-е изд., доп. Ч. 1-2. – Санкт-Петербург : тип. Э. Веймара, 1861 / Ч. 1. – VII, 291 с.; Ч. 2. – 276 с.

4. Лужинский, В. Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого / В. Лужинский. – Казань : типография Императорского университета, 1885. – 312 с.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 352.

6. НГАБ. Ф. 3245. Воп. 3. Спр. 51.

7. Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое : в 45 т. СПб. : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1649–1825.

8. Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе : в 55 т. – Санкт-Петербург: Тип. II отд. собственной ЕИВ канцелярии, 1830 – 1884.

9. Семашко, И. Записки Иосифа митрополита Литовского, изданные Императорскою Академиею Наук по завещанию автора : в 3 т. / митрополит Иосиф (Семашко). – Санкт-Петербург : Типография Императорской Академии Наук, 1883. – Т. 1–3.

10. Сестренцевич-Богуш, С. Дневник Сестренцевича, первого митрополита всех римско-католических церквей в России / Пер. под ред. В. Криксина. // Старина и новизна. – 1913. – Кн. 16. – С. I–III, 1–185; 1914. – Кн. 18. – С. I–II, 187–281; 1915. – Кн. 19. – С. 277–330; 1916. – Кн. 21. – С. 307–372; 1917. – Кн. 22. – С. 373–457.

11. Archetti, G.A. Les Jésuites de Russie (1783–1785) : un nonce du pape à ia cour de Catherine II : mémoires d'Archetti. – Paris : V. Palmé, 1872. – 207 p.

12. Directorium divini officii et missarum pro ecciestis Romano Catholicis archi-diecaesis Mohiioviensi per universum Imperium totius Russiae juxta computum veteris in annum post bissextilem primum a navitate vero domini MCCLXXXV. – Mohileviae: Typogr. IllmiE ac R.D. Archi-Epis. Mohll., 1785. – 124 s.

13. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. F. 694. Ap. 1. B. 172.

14. Szantyr, S. Zbiór wiadomości o kościele i rellgii katolickiej w Cesarstwie Rossyjskim, a szczególniej w prowincjach od Polski przyłączonych od czasu pierwszego rozbioru Polski aż do końca panowania Aiexandra I i początków panowania Mikołaja I. Zebrany z pism urzędowych, dokumentów i własnego widzenia jednego urzędnika rządowego – rossyjskiego / S. Szantyr. – Poznań: Wydawnictwo i druk. W. Stefańskiego, 1843. – Cz. 1–2. – 405 s.

15. Wereda, D. Biskupi unickiej metropolii kijowskiej w XVIII wieku. – Siedice-Lublin: Wydawnictwo Werset, 2013. – 375 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова